


Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 37(474) 20 ВЕРАСНЯ 2000 г.

Паседжанне Рэспубліканскай Рады ТБМ

14 кастрычніка 2000 года ў памяшканні кінатэатра "Змена" (праезд з вакзала трамваем № 7 альбо метро да ст. "Плошча Перамогі", а адтуль на трамваі №№ 3,6,8) адбудзецца паседжанне Рэспубліканскай Рады імя Францішка Скарыны.

Пачатак а **14.00.**

Асноўнае пытанне парадку дня – прыняццё плану дзейнасці ТБМ на 2001 г. У звязку з гэтым чакаем ад Вас пісьмовых прапаноў.

Тых, хто яшчэ не атрымаў новыя сяброўскія пасведчанні, просім захапіць фатаздымак памерам 3х4 (альбо 4х6). Просім таксама не пакідаць працы ў пашырэнні падпіскі на "Наша слова", разам з тым даводзім, што 14 кастрычніка ў кінатэатры "Змена" адбудуцца яшчэ два мерапрыемствы, у якіх Вы можаце ўзяць чынны ўдзел.

1. Агульнабеларуская навуковая канферэнцыя "Беларуская тапаніміка. Гісторыя і сучаснасць". Пачатак а 10 гадзіне.

2. Вечарына з нагоды 60-ых угодкаў ад дня нараджэння (10.10.1940г.) выбітнага беларускага пісьменніка і гісторыка Кастуся Тарасава. Пачатак а 19 гадзіне.

Транспартныя выдаткі сплочвае Таварыства.

Сакратарыят ТБМ.

Шаноўныя сябры!

Запрашаем Вас прыняць актыўны ўдзел у навуковай канферэнцыі "Беларуская тапаніміка. Гісторыя і сучаснасць", якую праводзіць ТБМ імя Ф.Скарыны 14 кастрычніка 2000 г. у памяшканні кінатэатра "Змена".

Просім Вас даслаць заяўкі на выступленні і тэзісы Вашых дакладаў (аб'ём 2-3 друкаваныя старонкі) да 5 кастрычніка 2000 г. на адрас: 220005 вул. Румянцава, 13 г.Менск.

Праезд іншагароднім будзе аплачаны.

Сакратарыят ТБМ.

Беларуская мова-



ТБМ

Наша будучыня

Ахвяраванні на ТБМ

1.	Паша Дзюк	25 руб.
2.	Арцём Кавалеўскі	50 руб.
3.	Карпіловіч Оля	35 руб.
4.	Матвіенка Алякс.	300 руб.
5.	Чугаеўскі Вова	200 руб.
6.	Махонь Антон	300 руб.
7.	Віўнік Вова	200 руб.
8.	Пажытак Арцём	21 руб.
9.	Касьянаў Аляксандр	10 руб.
10.	Мірэйчык Антон	20 руб.
11.	Міцкевіч Аляксан.	5 руб.
12.	Мухін Аляксандр	1000 руб.
	Усе Менск.	
13.	Саковіч Вольга (Літва)	10 $

Дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны па наданні роднай мове рэальнага статуса дзяржаўнай вымагае вялікіх выдаткаў. Падтрымаць ТБМ – справа гонару кожнага грамадзяніна краіны.

Просім Вашыя ахвяраванні дасылаць на адрас: вул. Румянцава 13, г.Менск, 220005, альбо пералічыць на разліковы рахунак ТБМ № 3015212330014 у Менскай гардырэкцыі ААТ Белбізнесбанка код 764 праз любое аддзяленне ашчадбанка Беларусбанк (камісійны збор пры гэтым не бярэцца).

Няма беларускамоўных класаў

Нарэшце пасля дзесятка гадоў будаўніцтва здадзена да пачатку новага навучальнага года Круглянская сярэдняя школа №2, што на Магілёўшчыне. Такі доўгабуд быў выкліканы адсутнасцю ў неабходнай колькасці фінансавых сродкаў.

Сам жа будынак новай школы разлічаны на 1151 вучня і спраектаваны вельмі зручна – тут ёсць усё для плённай вучобы дзетак. І можна зразумець іх радасць ад новага школьнага будынка. Толькі вось радасць для многіх дзетак – беларусаў не зусім шчырая, бо з усёй колькасці навучэнцаў няма тут ніводнага беларускамоўнага класа. Беларускую мову ў пачатковых класах школьнікі вывучаюць толькі чатыры гадзіны ў тыдзень, у той час як рускую – восем гадзін. Вось вам і выкананне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мовах", вось вам і славутае двухмоўе.

Такая ж карціна і ў іншых школах Круглянскага раёна.

З асобай цеплынёй успамінаецца пачатак 90-х гадоў, калі беларускаму народу, у тым ліку і школьнікам, вярталася іх родная мова. На беларускай мове дзеткі вучыліся размаўляць і ў садках. Да гэтага часу помню, як у бацькоў цеплынёй свяціліся вочы, калі іх дачушкі ці сыны гаварылі словы "настаўнік", "вучань", "сукенка", "дзённік", і інш.

Усведамляюць гэта кіраўнічыя работнікі ці не, а падобная дыскрымінацыя беларускай мовы яўна парушае закон Рэспублікі Беларусь "Аб мовах". Вось і атрымліваецца, што мову тытульнага народа Рэспублікі Беларусь вывучаюць на сваёй Радзіме, як замежную. Дзе яшчэ такое ўбачыш?!

Святаслаў Маханёк.

Падпіска на "Наша слова"

На працягу верасня г.г. Сакратарыят ТБМ ізноў падпісваў бібліятэкі розных рэгіёнаў Беларусі. З дапамогай суайчыннікаў і замежных ахвярадаўцаў бясплатную падпіску на газету ТБМ "Наша слова" на IУ квартал 2000 г. атрымалі: 42 раённыя бібліятэкі Клецкага р-на, 30 бібліятэк Гарадоцкага р-на, 35 бібліятэк Гарадзенскай вобл., 19 бібліятэк Лёзненскага р-на і 11 бібліятэк Шумілінскага, а таксама 124 школьныя бібліятэкі і іншыя ўстановы Заводскага, Ленінскага, Першамайскага р-наў г. Менска, 15 бібліятэк Менскай вобл.

Нягледзячы на павялічэнне кошту падпіскі (513 руб на адзін квартал), ТБМ здолеў падпісаць на верасень 280 бібліятэк на суму амаль 150.000 руб.

Лідская гарадская рада ТБМ падпісала на газету "Наша слова" бібліятэкі г. Ліды і Лідскага раёна, Лідскі гістарычна-мастацкі музей і адну бібліятэку Нясвіжскага раёна (усяго 12 асобнікаў).

Увага!

З другога верасня ў "Экалагічным цэнтры" па адрасе вул. Макаёнка, 8 пачала працу новая выстава беларускамоўных кніг, аўдыё -, і відэакасет, а таксама дыскаў CD. Тут можна пабачыць самую папулярную літаратуру, рарытэтныя выданні, а таксама набыць тое, што вы доўга шукалі, але не маглі знайсці.

Час працы на працягу верасня: субота, нядзеля з 10 да 14.30.

Наведвальнікам прэзэнтуюцца цудоўныя беларускія кнігі.

"Ой у лузе, лузе..."

27 верасня ў менскім Тэатры юнага гледача (Энгельса, 24) пройдзе прэзэнтацыя новага альбома фольк-гурта "Ліцьвіны" -- "Ой у лузе, лузе...". Пачатак канцэрта ў 19.00. Даведкі па тэл. 2-27-15-32. Сувязь з гуртом "Ліцьвіны" -- 2-39-01-66 (Уладзімір).

Сустрэча ў Слоніме

25 жніўня старшыня ТБМ Алег Трусаў наведаў Слонімшчыну, дзе меў сустрэчу з кіраўніцай слонімскай гарадской арганізацыі ТБМ спн. Таццянай Трафімчук, а таксама з прадстаўнікамі дэмакратычных арганізацыяў ды руху Слонімшчыны, мясцовым настаўніцтвам ды журналістамі рэгіёну. На сустрэчы спн. Трафімчук дала справаздачу пра дзейнасць Слонімскай арганізацыі ТБМ, распавяла пра мерапрыемствы, што ладзіліся цягам апошняга году. Суразмоўцы прыйшлі да высновы, што ёсць патрэба ў пашырэнні ды актывізацыі дзейнасці мясцовага ТБМ. Паколькі апошнім часам акрамя гарадской арганізацыі ў Слонімскім раёне ўтварылася яшчэ некалькі суполак ТБМ, было вырашана правесці ўстаноўчы сход ды стварыць Слонімскую раённую арганізацыю.

У сваю чаргу Алег Трусаў паведаміў пра намаганні Таварыства ў стварэнні Беларускага нацыянальнага універсітэта, пра адбылыя перамовы па гэтым пытанні з Адміністрацыяй Прэзідэнта і рэктарам БДПУ сп. Ціханавым. Ён даведаў таксама пра рашэнні Рэспубліканскай Рады, што мела месца 29 ліпеня, найбольш істотным з якіх было працягнуць з 1 верасня гэтага года збор подпісаў з патрабаваннем адкрыцця ў краіне БНУ, разам з тым нагадаў пра неабходнасць пашырэння падпіскі на газету ТБМ "Наша слова".

Наш карэспандэнт.

Асвечаныя духам Тарашкевіча

Прыемная навіна прыйшла з Радашковічаў. Там аднавіла сваю дзейнасць суполка Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. У горадзе, які мае багатую гісторыю, дзейнасць суполкі па вяртанні роднага слова пад дахі радашкавічан вельмі актуальная справа, асабліва ў сённяшнія дні – дні пагрозы для незалежнасці краіны. Тут была першая беларуская Гімназія імя Ф. Скарыны, зачыненая ў 1928 годзе, першая, дарэчы, была педагагічная семінарыя Расейскай імперыі. У беларускай Гімназіі вучыўся Максім Танк.

Упершыню на Беларусі менавіта ў Радашковічах была пастаўлена "Паўлінка", дзе прысутнічаў сам Янка Купала. Яго маленькага хрысцілі тут у касцёле, які камуністычная ўлада пераўтварыла ў звычайны вытворчы цэх. Зараз ён аднаўляе сваю дзейнасць, і толькі, як страшэнны напамін аб спробе індустрыяльнага пераўтварэння свету, руйнуючы духоўнае і святое, амаль уровень дзвюм вежам касцёла ўзвышаюцца два брудныя каміны керамічнай фабрыкі.

Тут з 1923 па 1931 год жыў Браніслаў Тарашкевіч. Захавалася хата на ёй ёсць мемарыяльная дошка. У суседняй хаце жыве Ірына Ніжанкоўская – унучатая пляменніца Аляксандра Уласава, унучка Андрэя Сніткі, дачка жонкі Браніслава Тарашкевіча з другога шлюбу. На вечарыне, што адбылася 26 жніўня, яна расказала шмат цікавага пра родны горад, яго знакамітых жыхароў. Адкрыў вечарыну старшыня суполкі ТБМ Алесь Шашута. Сярод сяброў ТБМ былі: з Беластоку – Кася Домбэк, з Варшавы Гражына Харытанюк. Дзейнасць ТБМ іх цікавіць даўно, добра ведаюць нашага старшыню Алега Трусава. У іх гонар мясцовы аматар ігры на губных гармоніках, паэт Часлаў Мацкевіч выканаў польскі гімн. Затым для ўсіх прысутных ён прачытаў свае вострa сатырычныя вершы. На вечарыне выступіў і прачытаў свае вершы намеснік старшыні Маладога фронту Алесь Блізнюк. З трывогай гаварыла аб будучых выбарах Ядвіга Цімафеева. А малады хлопец, які не прадставіўся, чамусьці настойліва патрабаваў адказаць чаму нацыянальныя сцягі вывешваюць ноччу і крыху гэтым папсаваў паэтычны настрой вечарыны. Аб дзейнасці ТБМ, ідэалагічных прыёмах, што прымяняюцца нашымі апанентамі, аб неадкладных задачах гарадской суполкі гаварыў госць з Менску, першы намеснік старшыні ТБМ Мікола Лавіцкі. Пасля вечарыны былі паказаны гістарычны кінафільм Юрыя Лысятова пра Радашковічы. З экрана гучалі мудрыя словы даследчыка, доктара гістарычных навук незабыўнага Міхася Ткачова, успаміны вучняў беларускай Гімназіі, уразілі здымкі адраджэння касцёла, асабліва тыя кадры, дзе бульдозерам з храма вышкрабаўся той бруд, які пакінулі святатацы. Чамусьці ўзнікла асацыяцыя параўнання дзейнасці суполкі ТБМ, Народнага фронту "Адраджэнне" з гэтым бульдозерам.

Пасля цёплых сустрэч, гутарку прадоўжылі на сядзібе Браніслава Тарашкевіча, дзе прысутнічаў яго воблік і маленькі бел-чырвона-белы сцяжок у гасціннай гаспадыні Ірыны Ніжанкоўскай. Добрым словам памянулі тых, хто стаяў ля вытокаў адраджэння нашай Бацькаўшчыны.

М.Л.

№ 37 (474) 20 ВЕРАСНЯ 2000 г. НАША СЛОВА

Як Кастусь Кашэль вучыў кантралёраў па-беларуску размаўляць

У рэдакцыю прыйшоў ліст ад Кастуся Кашэля, у якім ён дзеліцца сваім досведам змагання за права размаўляць па-беларуску ў Беларусі.

Актыўная пазіцыя грамадзян Беларусі прымусіла ўлады выдаць дакумент, які абавязвае валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі ўсё чынавенства і асоб, якія працуюць з людзьмі. З гэтым дакументам былі азнаёмлены кіраўнікі ўсіх установаў і прадпрыемстваў краіны.

Мушу сказаць, што я паўсюдна карыстаюся толькі маёй роднай беларускай мовай. Калі па прыватных справах звяртаюся ў дзяржаўныя органы, то прынцыпова не карыстаюся рускай мовай. Тым, хто паводзіць сябе гэтак жа, мяркую, не трэба тлумачыць, на якія негатыўныя адносіны да сябе можна патрапіць, як з боку часткі службоўцаў, так і з боку шараговых грамадзян.

Я не збіраюся скардзіцца на дыскрымінацыю дзяржаўнай мовы – скаргаў ужо досыць занатавана на старонках айчынных выданняў. Мэта майго расповеду – паказаць яшчэ адну сцяжынку да Мовы, дакладней – аднаго з чынаў законнага змагання за яе.

20-га лістапада мінулага года прыблізна а 11-й гадзіне дня аўтобус маршруту №1 спыніўся на канцавым прыпынку а/с "Дружная". Адчыніліся толькі пярэднія дзверы. Зразумела – кантроль праездных дакументаў. Ёсць у гэтым працэсе кантролю шмат прыніжальнага для людзей: гэты праход з квіточкам паадным каля кантралёра, выхад толькі ў тыя дзверы, куды табе загадалі, бескампрамісны тон загадаў, нібыта пасажыры – крымінальнікі. Але, мабыць, і мала хто такія адносіны лічыць знявагай, бо прыцярпеліся, прызвычаіліся –так і жывём. "Абы вайны не было". А духоўнае знішчэнне народа ўжо даўно з поспехам ідзе. Дзе па-езуіцку, хітра, дзе гвалтоўна знішчаецца ўсё нацыянальнае: мова, архітэктура, сам нацыянальны дух.

З такімі невясёлымі думкамі я падыходзіў да кантралёра, загадзя рыхтуючыся бараніць родную мову бо гэта ўжо не першыя мае непаразуменні ў транспарце праз мову.

- А в а сне часа-о ется? Ваш проездной билет! – звярнуўся да мяне кантралёр.

- Слухаю вас – сказаў я і ветліва ўсміхнуўся.

Кантралёр, мужчына гадоў трыццаці, незадаволена паўтарыў:

- Прошу показать проездной или оплатить штраф.

Я зноў усміхнуўся і сказаў:

- Шаноўны спадар, я бачу, што вы пры выкананні службовых абавязкаў і нешта ад мяне патрабуеце. Але я вас не разумею, бо карыстаюся толькі беларускай мовай. Прашу вас звярнуцца да мяне па-беларуску.

- Ого! Он ещё права качает. Платите штраф!

Я моўчкі пасунуўся да дзвярэй. Кантралёр з рускім лямантам учапіўся за мяне каб не адпусціць. Я спыніўся і павярнуўся да людзей, што стаялі за мной. Іх было чалавек дваццаць.

- Людцы мае! Будзьце сведкамі! Вы бачыце, як парушаюцца правы чалавека і Канстытуцыя краіны. Я патрабую, каб службовыя асобы звярталіся да мяне на дзяржаўнай беларускай мове, а мяне за гэта затрымліваюць.

"Людцы мае" моўчкі прайшлі міма. А адна добра апранутая саракагадовая жанчына "па-сяброўску" параіла:

- А ты иди к своему Позняку – пусть поможет. Потым, выходзячы з аўтобуса, чутна, дадала: " Тоже мне! Белорусского им захотелось"!

Калі ўсе пасажыры выйшлі, да "атакі" на мяне далучыўся і кіроўца аўтобуса. На патрабаванне звярнуцца да мяне па-беларуску чулася то "Я тебя не понимаю, говори по-человечески", то "Я не знаю белорусского. Я только вторую неделю как из России". Я настойваў на сваім, паказваючы дакумент, у якім гаварылася, што службовым асобам пры стасунках з людзьмі трэба ведаць дзве дзяржаўныя мовы. А мне, як прыватнай асобе, дастакова карыстацца адной. Я карыстаюся беларускай!

Далей былі пагрозы здаць мяне ў міліцыю. Трымалі мяне ў аўтобусе хвілін 20. Толькі пасля таго, як я дастаў з кішэні нататнік з асадкай і перапісаў з шыльды на кабіне прозвішчы кіроўцаў аўтобуса (кантралёр сваё прозвішча перапісаць з нагруднай шыльды не даў), кіроўца выціснуў з сябе:

- Калі вы не аплацілі проезд, плаціце штраф.

- Даражэнькі вы мой! Які штраф? Вось, зірніце калі ласка, - і паказаў яму свой праязны на месяц.

Кантралёр махнуў у бок дзвярэй:

- Открой! - І сам выскачыў першым, не развітаўшыся. Невыхаваныя нейкія яны "только русскоязычные".

Кіроўца, злы, але па-беларуску:

- Ну і дзеля чаго трэба было камедыю рабіць? Ён жа толькі што з Расіі – адкуль яму ведаць беларускую мову? Што, ён і на хлеб у нас зарабіць не можа?

- Можа. І павінен зарабляць. Але моваю пры рабоце з людзьмі валодаць абавязаны. Калі ж я, напрыклад, прыеду ў Маскву, укладкуюся кантралёрам і буду ўжываць толькі беларускую мову, а рускім людзям казаць: "Я вас не разумею. Размаўляйце па-людску", - то мяне адразу з працы зволяць. Чаму ж іншаземец можа тут вольна працаваць, зневажаючы беларусаў?

Кіроўца задумаўся:

- Мо яно і так... калі падумаўшы.

- Думай.

Вось такое здарылася са мной.

Таму ў мяне ёсць прапанова да ўсіх рэгіянальных арганізацый ТБМ. Стварыць камісіі па праверцы выканання ўрадавых дакументаў, якія абавязваюць службовых асоб у зносінах з людзьмі ўжываць беларукую мову. Добра было, каб пра гэтыя камісіі ведалі ў райвыканкамах, каб сапраўды за абарону роднай мовы цябе не пачалі судзіць у сваёй жа краіне.

Кастусь КАШЭЛЬ.

Ад рэдакцыі: відавочна, што не да ўсіх дзяржаўных службоўцаў давялі законы, якія абавязваюць ужываць беларускую мову ў стасунках з беларускамоўнымі грамадзянамі. Варта яшчэ раз нагадаць, што 29 кастрычніка 1999 г. прынятыя змены ў Адміністрацыйны кодэкс: " ".

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб унясенні дапаўненняў у кодэкс Рэспублікі Беларусь

Аб адміністратыўных правапарушэннях

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 28 кастрычніка 1999 года.
Адобраны Саветам Рэспублікі 18 лістапада 1999 года.

Артыкул 1. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 6 снежня 1984 года (33 БССР, 1984 г., № 35, арт. 505; 1986 г., № 28, арт. 362; 1989 г., № 10, арт. 94; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1996 г., № 23, арт. 425; Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 5, арт. 27; Нацыянальны рэестр прававых акта Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 54, 2/56), наступныя дапаўненні:

1. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 172.2 наступнага зместу:

"Артыкул 172\2. Парушэнне заканадаўства аб мовах.

Публічнае зняслаўленне дзяржаўных і іншых нацыянальных моў, якімі карыстаецца насельніцтва Рэспублікі Беларусь, стварэнне перашкод і абмежаванняў у карыстанні імі –цягнуць накладанне штрафу на грамадзян у памеры ад дзвюх да пяці мінімальных заработных плат, на службовых асоб – у памеры ад пяці да дзесяці мінімальных заработных плат".

2. Частку першую артыкула 199 пасля лічбаў "172" дапоўніць лічбамі "172\2".

2. Абзац трэці пункта 1 часткі першай артыкула 234\1 пасля лічбаў "172" дапоўніць словамі "артыкула 172\2".

Артыкул 2. Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

24 лістапада 1999 г., г.Мінск, № 325-3.

Слоўнік "Свабоды"

Летась Беларуская служба радыё "Свабода" ажыццявіла надзвычай цікавы, на наш погляд, праект. Штодня ў эфіры з'яўлялася рубрыка "Слоўнік "Свабоды", пад якой гучала міні-эсэ пра тое ці іншае слова, у якім у нейкай ступені адлюстроўвалася беларуская гісторыя XX стагоддзя. Аўтарамі эсэ былі журналісты, пісьменнікі, мастакі, гісторыкі, проста слухачы РС. Вынікам праекту станецца кніга. Сёння мы працягваем знаёміць Вас з старонкамі "Слоўніка "Свабоды", напісанымі Уладзімірам Арловым.

У публікацыі захаваны правапіс аўтара.

(Ад рэдакцыі).

Слоўнік "Свабоды"

Лябірынт

Лябірынт – знакавае слова беларускай культуры. Цягам стагодзьдзяў беларусы ратавалі ў нябачных чужынскаму воку схованках мову, звычаі, памяць. Старажытную беларускую цывілізацыю, схаваную ад захопнікаў у полацкіх лёхах, паказаў у сваёй фантастычнай аповесьці "Лябірынты" Вацлаў Ластоўскі.

Слова "лябірынт" прыйшло да нас з антычнасьці. У грэцкай міталёгіі Лябірынтам называлася збудаваная на востраве Крыт грандыёзная спаруда з заблытанымі хадамі, адкуль аніхто ня мог выбрацца. У Лябірынце жыла крыважэрная пачвара – чалавекабык Мінатаўр, якому аддвалі на разарваньне маладых афінятаў. Першым, хто выбавіўся зь Лябірынту, быў пераможца Мінатаўра Тэзей, якому дапамог клубок нітак, падараваны герою закаханай у яго Арыяднай.

Беларусь мае свае лябірынты – і легендарныя, і мэтафарычныя і цалкам рэальныя. Найславуцейшы зь іх – Полацкі, разгалінаваная сістэма падземных хадоў-лёхаў, якая ў сярэднявеччы злучала гарадзкія манастыры й храмы.

Магчыма, менавіта там, у Полацкім лябірынце, у гады Інфлянцкае вайны зьнікла славутая Полацкая бібліятэка з кнігамі, пісанымі рукой самой сьвятой Еўфрасіньні? Можа, якраз у гэтых таямнічых лёхах некалі знойдзецца неацэнны Полацкі летапіс? Існуе вэрсія, згодна зь якой у 1941 годзе зьнікла толькі копія нашай нацыянальнай сьвятыні – Крыжа Лазара Богшы, а арыгінал таксама трэба шукаць у полацкіх сутарэньнях.

Цяперашняя ўлада асуджае беларускую культуру на напалову падпольнае існаваньне, зноў заганяючы яе ў сутарэньні.

Ужо каторы год краіна блукае ў лябірынце, шукаючы зь яго выйсьце ў XXI стагодзьдзе.

Слоўнік "Свабоды"

Жорны

Жорны, або ручны млын, - адна з найгалоўнейшых вынаходак чалавека. Дзякуючы жорнам, людзі атрымалі хлеб.

Некалі жорны былі амаль у кожным беларускім сялянскім двары, займаючы пачэснае месца ў сенцах ці самой хаце. За дзень на каменных жорнах можна было змалоць тры пуды жыта.

У гады калектывізацыі ў незаможных вёсках, што стаялі на пяшчаных полацкіх землях, гаспадароў жорнаў, выконваючы разнарадку, часта запісвалі ў кулакі. Васіль Быкаў згадваў пра аднавяскоўца, які каб уратавацца ад Сібіры, прынародна разбіў свае жорны на панадворку. Удзень раскалатыя камяні-жарнавікі ляжалі навідавоку, а па начах гаспадар і суседзі скручвалі іх дротам і употай малолі зерне.

Энцыкляпэдыя этнаграфіі Беларусі сьцвярджае, што жорны захоўваліся ва ўжытку да 50-х гадоў XX ст. але гэта ня так. Нягледзячы на велічныя посьпехі савецкага народу ў камуністычным будаўніцтве, яшчэ напрыканцы 60-х, бавячы лета ў роднай мамінай вёсцы на Шклоўшчыне, я шмат разоў уласнаручна круціў бабуліны жорны.

У далёкіх лясных вёсках, дзе жыве дзесяткі два старых, дзе бліжэйшая крама за 10 кілямэтраў, а аўталаўка з хлебам прыязджае раз у пару тыдняў, жорны і сёньня ратуюць беларускага селяніна.

Апошні раз жывыя жорны мне выпала бачыць у забытай Богам і ўладаю расонскай вёсачцы на мяжы з братняй Расеяй. "Галасавалі, дзетка, за таго Лукашонка, а цяпер во гора сваё на жорнах мелім", - сказала старая кабета зь некалі блакітнымі вачыма. Размова адбывалася летась, значыцца энцыкляпэдычны артыкул пра жорны вымагае напрыканцы стагодзьдзя істотнага ўдакладненьня.

Пэўна, беларускія жорны канчаткова ператворацца ў экспанаты музэяў толькі тады, калі тудысама будзе сьпісаны й наш унікальны "рынкавы сацыялізм".

Слоўнік "Свабоды"

Заходнік

У тлумачальным слоўніку беларускае мовы можна са зьдзіўленьнем вычытаць, што ***"заходнік"*** – гэта ***"прыхільнік заходніцтва"***, як альтэрнатывы славянафільству. Між тым кожнаму беларусу вядома, што заходнік – гэта чалавек, якому пашчасьціла жыць на той частцы Беларусі, куды бальшавіцкія парадкі прыйшлі толькі ў верасьні 1939 году.


Доўгі час пасьля гэтак званага вызвольнага паходу Чырвонай арміі слова "заходнік" у партыйна-савецкім лексыконе азначала чалавека недабранадзейнага, гатовага ў любы зручны момант здрадзіць сьветлым ідэалам сацыялізму ды схаўрусавацца з клясавым ворагам. Каб заходнікі мацней палюбілі родную савецкую ўладу, іх дзесяткамі тысячаў вывозілі ў сыбірскія ды казахстанскія лягеры. Адных – за тое, што багацей жылі, другіх, як Натальлю Арсеньневу, за тое, што пісалі вершы пра Беларусь, а не БССР, трэціх – проста за тое, што скоса пазіралі на прысланае Масквой начальства.

Тым часам для паспалітых жыхароў усходняе Беларусі слова ***"заходнік"*** на некалькі дзесяцігодзьдзяў сталася сынонімам чалавека заможнага й грунтоўнага. Калі ўсходнікі аддавалі дачку замуж за заходніка, лічылася, што маладзіцы пашанцавала. "У нас хлеб з кавалачкам сала, - з зайздросьцю казалі на спустошанай калгасамі памежнай Полаччыне, а ў іх, заходнікаў глыбоцкіх, - сала з кавалачкам хлеба".

Напрыканцы XX стагодзьдзя колішняга падзелу беларускага грамадства на ўсходнікаў і заходнікаў нібыта і не адчуваецца. Але на захадзе краіны па-ранейшаму жывуць лепей. Там чысьцейшыя ды ўтульнейшыя гарады й мястэчкі. Там багацейшыя вёскі дый самі людзі – самавіцейшыя.

Як казалі калісьці камуністычныя прапагандысты ды агітатары: "Вот оно, тлетворное влияние Запада".

Уладзімір АРЛОЎ.



Падзялілі футра незабітага мядзведзя

14-16 ліпеня на Грунвальдскім полі прайшло святкаванне 590-х угодкаў перамогі ў Вялікай вайне. Выступалі прэзідэнты Польшчы і Летувы Аляксандр Квасьнеўскі і Валдас Адамкус. За час святкавання ў прамовах ні разу не было што-небудзь сказана аб Беларусі і беларусах.

У крыніцах войска ВКЛ паказана як літоўска-рускае, як дарэчы тады і называліся продкі сучасных беларусаў. На гэтай падставе гісторыю нашых продкаў падзялілі паміж сабой сучасныя літоўцы і рускія, якія ў тыя часы называліся жмудзінамі і аўкштайтамі, а расейцы маскавітамі ці маскалямі.

Вось як напісана аб Грунвальдскай бітве ў сучасным расейскім падручніку "Русская история", Санкт-Пецярбург, 1999. "Польским войском командовал Ягайло, а литовско-русское возглавлял Витовт, участвовали отряды из Чехии и татары".

Хочаш смейся хочаш плач, аказваецца па звестках сучасных расейскіх гісторыкаў беларусаў, якія былі прадстаўлены харугвамі амаль ў усіх тагачасных гарадоў на тэрыторыі Беларусі пад Грунвальдам не было.

На конт рускіх і літоўцаў зразумела, яны проста бессаромна прысабечылі нашу славутую спадчыну, а вось навошта здзеквацца з гісторыі палякам. Ад таго, што у Беларусі зараз такі рэжым, які святкуе ў асноўным сталінскія святы, не могуць стаць тыя, хто ваяваў у войску ВКЛ на грунвальдскім полі і кроў якіх цячэ ў жылах сучасных беларусаў, продкамі сучасных рускіх ці літоўцаў. Цудоўна вядома, з якіх гарадоў былі харугвы ў войску ВКЛ.

Таксама мяркую, што тэрмін якім у асноўным карыстаюцца даследчыкі "беларуска-літоўскі" ці "літоўска-беларускі" не зусім правільна выкарыстоўваюць у дачыненні да часоў ВКЛ. Калі казаць аб войску ВКЛ, якое ў крыніцах называецца літоўска-рускім, то на мой погляд правільна яго называць проста беларускім. Ці абавязкова тлумачыць, што так у тыя часы называліся продкі беларусаў. Тады можа будзе менш блытаніны, якую нашы суседзі падманна выкарыстоўваюць

Тамаш УРУБЛЕЎСКІ.

Добры дзень, паважаная рэдакцыя "Нашага слова"!

Пiша вам вучань 8 "Б" класа СШ №2 г.Бярозы Шуст Ілля. Я выпісваю вашу газету і з задавальненнем яе чытаю. У "Нашым слове" шмат цікавых і грунтоўных артыкулаў. І я хацеў бы вам прапанаваць у вашай газеце пабольш расказваць, ці наогул пачаць рубрыку аб помніках беларускай літаратуры: разнастайных летапісах, друкаваных кнігах Скарыны і Буднага, аб газеце "Мужыцкая праўда" і г.д. Думаю, што артыкулы будуць цікавыя.

Сам я вучуся ў рускамоўным класе, але дома стараюся размаўляць па-беларуску. У школе мае аднакласнікі здзіўляюцца, што мне падабаецца мая родная мова, што я размаўляю па-беларуску, а самі яны яе "терпеть не могут"! Так іх выхавалі бацькі... Таму я лічу, што дзейнасць ТБМ сёння вельмі неабходна каб дапамагчы людзям зразумець, што нельга цурацца сваёй мовы.

Я вельмі хацеў бы пасля школы вучыцца ў пакуль яшчэ не існуючым БНУ. Актывісты ТБМ збіраюць подпісы за стварэнне гэтай навучальнай установы, і я хачу спытаць, ці можна ставіць у падпісныя лісты свае подпісы непаўнагоднім дзецям. Было б добра, калі б вы напісалі гэта ў газеце ці проста адказалі на мой ліст.

Жыву я даволі далёка ад Менска і рэдка бываю там. І я хачу купіць кнігу "Аняменне". Ці магчыма гэта зрабіць поштай? Вельмі прашу адказаць на мой ліст.

Ілля ШУСТ.

***Ад рэдакцыі:** кнігу "Аняменне" можна замовіць у сядзібе ТБМ, умовы -- па тэлефоне 8-017-284-85-11. У падпісных лістах за БНУ не ставіцца дата нараджэння.*

Бібліятэка Кніжнага клуба ТБМ

12 верасня 1999 г. распачала сваю дзейнасць Бібліятэка Кніжнага клуба ТБМ. Бібліятэка мае на мэце збіранне і прадстаўленне чытачам літаратуры беларусазнаўчага характару беларускіх і замежных даследчыкаў, твораў беларускіх аўтараў як на беларускай мове, так і ў перакладах на іншыя мовы, а таксама перакладаў твораў сусветнай літаратуры на беларускую мову.

Сёння фонд бібліятэкі налічвае каля 1000 адзінак – кнігі, перыядычныя выданні, выяўленчыя матэрыялы. Сярод найбольш каштоўных збораў бібліятэкі – беларускія выданні пачатку XX ст. (Кнігі, што належалі Віленскай беларускай гімназіі, беларускамоўныя падручнікі, творы класікаў нацыянальнай літаратуры – М. Гарэцкага, У. Галубка, Я. Коласа і інш.); кнігі, што выйшлі ў БССР у 20-40 г.г.; выданні беларускай эміграцыі. Бібліятэка атрымала ў падарунак кнігі з асабістага кнігазбору Міхаіла Дубянецкага (сярод іх – працы Улашчыка М., першыя карэктатуры твораў В. Быкава, С. Палуяна); а таксама каштоўныя эміграцыйныя выданні, дасланыя са Злучаных Штатаў Амерыкі сям'ёй Кіпеляў. Многія кнігі, што захоўваюцца ў бібліятэцы, маюць аўтографы аўтараў.

Бібліятэка Кніжнага клуба ТБМ працуе тры разы на тыдзень:

Панядзелак і чацвер – 15.00 – 17.00, нядзеля – 14.30 – 17.30.

Сувязь ТБМ і школы пашыраецца

25 жніўня старшыня Менскай гарадской арганізацыі ТБМ імя Ф.Скарыны Алена Анісім і яе намеснік Леанарда Мухіна наведалі лінгвістычны комплекс – гімназію-каледж № 24. У гэты дзень тут адбывалася пасяджэнне секцыі настаўнікаў беларускай мовы Цэнтральнага раёна. Аб сустрэчы было дамоўлена загадзя з гарадскім упраўленнем адукацыі, з Цэнтральным раённым аддзелам адукацыі, а таксама з адказнымі за правядзенне жнівеньскай нарады.

Слова прадстаўнікам Таварыства было дадзена на самым пачатку пасяджэння. Алена Анісім павіншавала настаўнікаў з надыходзячым святам – Днём Ведаў, нагадала пра поспех настаўнікаў роднай мовы, засведчаны вынікамі ўступных экзаменаў у ВНУ і адзначаны Дзяржаўнай камісіяй. Акрамя таго, яна расказала аб мэтах і задачах дзейнасці ТБМ, пазнаёміла з выдавецкімі навінкамі гэтай грамадскай арганізацыі – паштоўкамі, календарыкамі і інш., паведаміла аб мерапрыемствах, якія праводзяцца сіламі сяброў як гарадской, так і Рэспубліканскай Рады. Сп. Л.Мухіна запрасіла ўсіх, хто жадае наведаць кніжную выставу, якая працуе ў сядзібе на вул. Румянцава, 13, а таксама на дэманстрацыю відэафільмаў, агучаных па-беларуску. Асаблівую цікавасць выклікала ў настаўнікаў магчымасць арганізаваць сустрэчы вучняў з беларускімі пісьменнікамі. На развітанне для раённага аб'яднання настаўнікаў былі перададзены экзэмпляры "Нашага слова", невялікая бібліятэка кніг на беларускай мове, а таксама паштоўкі і каляндарыкі.

А. А.

З глыбінь вякоў прасветленыя твары



Пры культурным цэнтры Беларускага фонду Рэрыхаў, па ініцыятыве фонду сумесна з Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Францішка Скарыны адкрылася выстава "З глыбінь вякоў прасветленыя твары". Сабраныя разам карціны вядомых беларускіх мастакоў даносяць да нас святло вобразаў вялікіх асветнікаў Зямлі Беларускай - Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францішка Скарыны, Сімяёна Полацкага.

На здымку: Алесь Марачкін, "Ефрасіння Полацкая", 1983 г. Дыван. Алей.

Фота Аляксандра Дзідзевіча, БелТА.

Сустрэча з настаўнікамі Партызанскага раёна

У актавай зале СШ № 10 прайшла сустрэча кіраўніцтва Таварыства беларускай мовы з настаўнікамі школаў Партызанскага раёна. Гэтай падзеі паспрыялі гарадскі і раённы аддзелы адукацыі, а таксама кіраўніцтва 10-ай школы.

На сустрэчы старшыня Таварыства Алег Трусаў распавёў пра дзейнасць арганізацыі, пра ролю беларускай мовы ў гісторыі і сучасным жыцці нашай краіны. Ён зазначыў, што ў апошнія гады ТБМ вядзе актыўную падтрымку беларускага школьніцтва: ладзіць конкурсы, сустрэчы з пісьменнікамі, распаўсюджвае бібліятэчкі кнігаў. А ў гэтым годзе Рэспубліканская Рада з Менскай гарадской арганізацыяй вырашыла ладзіць сістэматычныя сустрэчы з настаўнікамі падчас секцыйных ды пленарных пасяджэнняў.

Трэба падкрэсліць, што асаблівую ўвагу настаўнікаў выклікала паведамленне пра акалічнасці ўтварэння Беларускага нацыянальнага універсітэта. У магчымасцях ТБМ весці шырокі спектр перамоў, праводзячы вырашэнне важнай справы ўтварэння БНУ у рэальную плынь, настаўнікаў пераканалі стасункі Таварыства з Адміністрацыяй Прэзідэнта і рэктарамі найбуйнейшых ВНУ краіны.

Намеснік старшыні ТБМ Людміла Дзіцэвіч азнаёміла ўсіх з дзейнасцю сядзібы ды запрасіла на вул. Румянцава, 13, дзе кожны можа пабачыць выставу найлепшых беларускіх кніжак, якуюсь з іх замовіць, набыць беларускамоўныя відэа-, аўдыёкасеты, а штосуботы патрапіць на пасяджэнне відэа- альбо кніжнага клуба ці пагартаць старонкі рэдкіх выданняў з бібліятэкі ТБМ, бліжэй пазнаёміцца з друкаваным органам Таварыства – газетай "Наша слова". На сядзібе можна атрымаць і бібліятэчку беларускіх кніжак для ўзнагародаў вучняў падчас конкурсаў ды алімпіяд.

Кіраўнікі ТБМ прапанавалі настаўнікам далучыцца да дзейнасці арганізацыі, уваійсці ў шэрагі сяброў і супольна працаваць на ніве беларушчыны. Раённаму аддзелу адукацыі была падараваная бібліятэчка кніжак, паштоўкі, каляндарыкі. СШ № 10 атрымала ад ТБМ дыскету з запісам беларускіх кніг. Варта заўважыць, што гэта першая ў Беларусі дыскета такога кшталту, стварыў яе студэнт БДЭУ сябра Менскай гарадской Рады Алесь Стральцоў. Для адзінай жа ў Партызанскім раёне сталіцы беларускамоўнай школы № 72 у сядзібе падрыхтавалі бібліятэчку з добрых беларускіх кніжак.

Нягледзячы на тое, што настаўніцтва сёння найбольш заклапочанае эканамічнымі ды сацыяльнымі праблемамі, сустрэча мела ўсё ж стваральны характар. Гэта пацвердзілі і пытанні, а таксама просьбы ды прапановы, з якімі звярталіся настаўнікі да кіраўнікоў ТБМ.

Людміла ДЗІЦЭВІЧ, нам. старшыні ТБМ.

ПЛАДЫ ДВУХМОЎЯ

Арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы канферэнцыі "Проблемы прогнозирования и государственного регулирования социально-экономического развития" пры Навукова-даследчым эканамічным інстытуце Міністэрства эканомікі, якая мелася адбыцца 12-13 кастрычніка 2000 г., адмовіўся прымаць тэзісы на беларускай мове. Некалькім аўтарам было прапанавана ў кароткі тэрмін перакласці свае творы на расейскую мову і толькі тады здаць іх. Як патлумачыў адзін з супрацоўнікаў аргкамітэту, прычына ў тым, што большасць аўтараў падала тэзісы на расейскай мове (123 чалавекі), значыць і вы павінны падаць на ёй, каб не выглядаць "белымі крумкачкамі". Па яго ж словах, у гэтай даследчай установе упершыню сутыкаюцца з выпадкам, калі навукоўцы, няхай і маладыя, падаюць свае працы на беларускай мове. Тут беларускую мову не ведаюць і на ёй карэктаваць не будуць. Спасылка на 50-ты артыкул Канстытуцыі і закон аб мовах ніякага выніку не атрымала, нясіце на расейскай і ўсё.

Для прыхільнікаў двухмоўя хочацца заўважыць, што калі б адзінай дзяржаўнай мовай была беларуская, такога выпадку не здарылася б. Сёння дэклараванае двухмоўе, рэальна ў жыцці з'яўляецца расейскім аднамоўем, і дае падставы некаторым установам, існуючы на дзяржаўныя сродкі і знаходзячыся пад прыкрыццём улады, увогуле не рэагаваць на моўныя змены ў грамадстве. Завітаўшы да іх, складваецца ўражанне, што апынуўся дзесьці ў 1980 годзе.

Выклікае здзіўленне і вялікі сумнеў, як эканамісты могуць прапанаваць выйсце з эканамічнага крызісу, вырашыць эканамічныя праблемы, перад якімі паўстала беларускае грамадства, калі яны не ў стане падыйсці да іх вырашэння з боку інтарэсаў Беларусі, як незалежнай самастойнай краіны. Бо ў свядомасці і псіхалогіі гэтых людзей у я касці роднай краіны працягвае існаваць прастора ад Калініграда да Уладзівастока, Беларусь разглядаецца імі як частка "вялікай Расеі", беларуская мова – як непатрэбная рэч у справе ўз'яднання Беларусі і Расеі.

Уладзь КАЛІНА.

Слухаем беларускае, спяваем па-беларуску!

“Хрыстос уваскрос!” Вялікодныя сьпевы гурта “NEWCOSMOPOLIS”, 1999, БМА-груп.

“Хрыстос нарадзіўся!” Калядныя сьпевы гурта “NEWCOSMOPOLIS”, 1999, БМА-груп.

Відавочна, што беларуская Грэка-Каталіцкая царква робіць для беларусізацыі свайго царкоўнага жыцця ці не больш за іншыя канфесіі. Сапраўды, не паспелі вернікі-вуніяты ўзрадавацца такой важнай падзеі – зацвярджэнню Ватыканам багаслужбоўных тэкстаў у перакладзе на беларускую мову айца Аляксандра Надсана, як намаганнямі ды ахвяраваннямі вернікаў, святароў ды музыкаў выдадзеныя дзве касеты з беларускамоўнай хрысціянскай музыкай – “Хрыстос нарадзіўся!” і “Хрыстос уваскрос!” з каляднымі і вялікоднымі спевамі віцебскага гурта “NEWCOSMOPOLIS” (“Новы касмічны горад”) пад кіраўніцтвам Я. Савельева.

Першыя ўражанні ад твораў альбому “Хрыстос уваскрос!” – стрыманасць музычных фарбаў, карэктнасць да рэлігійных пачуццяў вернікаў іншых канфесій. Бачна, што ў выканаўцаў ёсць цвёрдае перакананне ў тым, што беларускае слова, звернутае да Бога, будзе абавязкова пачутае – бо яно Боскае!

Ужо ў першым творы альбому “Словы” адчуваецца імкненне скарыстаць незвычайныя тэмбры і магчымасці сінтэзатараў, выкарыстаць элементы джазавай імправізацыі. Але галоўным прынцыпам кампазіцыі твораў становіцца гарманічнае спалучэнне мелодыі і тэкстаў –своеасаблівых малітваў, праслаўленняў і каянняў – (творы “Добры Самаранін”, “Сьвяты Язафат”, “Сьвятая Еўфрасіньня”). Сапраўды ўражвае і кранае душу хрысціянская песня – эмацыянальны стрыжань альбому – “Сьвятая Марыя” у выкананні лідара гурта Я. Савельева. Лепшы, на маю думку, нумар альбомаў!

Другі бок альбому амаль цалкам складваецца з разгорнутых музычных палотнаў-кампазыцый хрысціянскай, біблейскай і патрыятычнай накіраванасці : песні “Цела і кроў”, “Калі ў руцэ трымаеш Крыж”, “Хрыстос уваскрос!”, “Званы Беларусі”. У кожнай з іх слухач адзначыць адметныя музычныя фарбы – унісонныя імправізацыі раяля Анатоля Вярэнічa ды гітары Міхася Фурса, “касмічныя” сола клавішных Уладзіміра Чэха, характэрныя для хрысціянскіх выканаўцаў меладычныя пераліўы званоў ды харавыя спевы.


На ўсім гэтым узнёслым музычным ланшафце дысанансам выглядаюць рэцэдывы старой хваробы гурта – неадпаведнасць некаторых складаных тэм яго музычнаму ўвасабленню. Цяжка адчуць пад манатонны дыскатэчны рытм ды легкадумныя саксафонныя сола сэнс і боль тэм, што ўздымаюцца ў такіх творах, як “Пяцёра пакутнікаў Полацкіх”, “Гутарка з Богам”... Ці ж гэта не падстава для крытычных заўваг!

На шчасце, такіх неадпаведных тэм на касеце не шмат, а другі альбом гурта “NEWCOSMOPOLIS” “Хрыстос нарадзіўся!” складаюць такія хрысціянскія творы, якія хочацца спяваць разам з музыкамі – настолькі мелодыі каляднага альбому светлыя, кранальныя, а аранжыроўка мяккая ды беражлівая!

Паслухайце першы нумар альбому – твор “Хрыстос нарадзіўся!”, стылізаваны пад калядку, у фальклорным стылі, альбом “Маленькае сонейка”, што гучыць пад акампанемент класічнай гітары ды іншыя творы... Шчырасць выканання, біблейскія паралелі, чуллівыя мелодыі ствараюць святочны настрой, прадчуванне таго, што “У цудоўную ночку Ісус нарадзіўся, да Матачкі Боскай Хрыстос прытуліўся...”.

Адзначым і вельмі ашчадную ды грунтоўную кампазіцыйную працу Я. Савельева, калі размова ідзе пра песні на незабыўныя вершы Ларысы Геніюш. Ці не прыклад арганічнага спалучэння высокай духоўнай паэзіі ды высокароднай мелодыкі? Песні з гэтых альбомаў хачацца спяваць супольна ў шчыльным сяброўскім ці сямейным коле.

Калі ўспомніць досвед хрысціянскіх місіянерскіх службаў, дык ён відавочна даказвае, што супольнае выкананне духоўнай музыкі паскарае працэс евангелізацыі, а ў выпадку з песнямі “NEWCOSMOPOLIS” і беларусізацыі, вернікаў. У гэтым, так-



сама, бачыцца адна з мэтаў выпуску такіх музычных навінак.

Па касеты можна звярнуцца ў БМА-груп па тэлефоне (017) 249-08-88, альбо на адрас: Менск а/с 5.

Анатоль МЯЛЬГУЙ.

Давайце спяваць па-беларуску

КАЛІ КАЛІНА НЕ ЦВІЛА

песня з рэпертуару ансамбля “СВЯТА”

Словы і музыка народныя.
Песня запісана на радзіме Івана Мележа.



Калі каліна не цвіла,
То не ламай каліну.
Калі ты ў арміі не быў,
То не кахай дзяўчыну.

Прыпеў:

Я памятаю той жа час,
Ты плакала за мною,
На развітанне раз у раз
Махала хусцінаю. | *2 разы*


Не трэба было разбіваць
Грачнёвыя паловы.
Не трэба было задаваць
Гарачае любові.

Прыпеў.

Калі каліна адцвіла,
Тады ламай каліну.
Калі ты армію адбыў,
Тады кахай дзяўчыну.

Прыпеў.

“Белая Вежа”



У Берасці 8 верасня адкрыўся міжнародны тэатральны фестываль “Белая Вежа”, у якім прымаюць удзел 25 тэатральных калектываў з 13 краін.

На здымку: сцэна з спектакля нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы “ Князь Вітаўт”.

Фота Рамана Кабяка, БелТА.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 18. 09. 2000 г.
Наклад 2700 асобнікаў. Замова № 2354
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 171 руб., 3 мес.- 513 руб.
Кошт у розніцу: 40 руб.